# ІНФАРМАЦЫЙЕЫ БЮЛЕТЭНЬ АБ ПРАЕКЦЕ

Funded by the European Union

**Рэгіянальны механізм развіцця грамадзянскай супольнасці краін Усходняга партнёрства (Eastern Partnership Civil Society Facility)**




**Тэрміны рэалізацыі:** 28.06.2021 - 27.12.2024

**Краіны УП:**

Азербайджан, Арменія, Беларусь, Грузія, Малдова, Украіна

**Унёсак ЕС:** € 3 698 750

**Агульны бюджэт:** € 3 698 750

**Арганізацыя(і) выканаўца(ы):**

GDSI Limited (Ireland) in consortium with Altair Asesores S.L. (Spain), Office for European Expertise and Communications (Belarus), Innovative Education

**Вэбсайт праекта:** https://eapcivilsociety.eu/

**Спасылкі на профілі ў сацыяльных сетках:**

https://www.facebook.com/EaPCivilSociety,
https://twitter.com/EaPCivilSociety,
www.linkedin.com/company/eap-civil-society-facility,
https://t.me/EaPCivilSociety

**Апісанне праекта:**

Праект Еўрапейскага саюзу «Рэгіянальны механізм развіцця грамадзянскай супольнасці краін Усходняга партнёрства» садзейнічае ўзмацненню ролі і павышэнню патэнцыялу грамадзянскай супольнасці ў шасці краінах Усходняга партнёрства.

Праект прапануе актывістам і арганізацыям грамадзянскай супольнасці з краін Усходняга партнёрства наступныя магчымасці:
- Навучанне прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці.
- Штогадовыя хакатоны грамадзянскай супольнасці для распрацоўкі новых ідэй і інструментаў, прызначаных для забеспячэння празрыстасці, падсправаздачнасці і ўдзелу.
- Стыпендыяльная праграма (Civil Society Fellowships) для 120 актывістаў грамадзянскай супольнасці.
- Удзел прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці ў рэгіянальных і міжнародных мерапрыемствах.
- Нетворкінг паміж прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці і падтрымка адпаведных ініцыятыў.
- Інфармацыйныя кампаніі для павышэння дасведчанасці грамадскасці аб рабоце грамадзянскіх арганізацый.
- Правядзенне даследаванняў па пытаннях грамадзянскай супольнасці ў рэгіёне (на запыт ЕС).

**Чаканыя вынікі:**

- Павышэнне патэнцыялу арганізацый грамадзянскай супольнасці і актывістаў з краін Усходняга партнёрства для ўдзелу ў распрацоўцы заканадаўства і палітычным дыялогу.
- Павышэнне падсправаздачнасці і празрыстасці работы арганізацый грамадзянскай супольнасці.
- Паляпшэнне іміджу арганізацый грамадзянскай супольнасці ў краінах Усходняга партнёрства.
- Забеспячэнне прадстаўнікоў Еўрапейскай камісіі інфармацыяй, якая дазволіць ім лепш разумець праблемы арганізацый грамадзянскай супольнасці ў краінах-партнёрах і планаваць будучыя праграмы фінансавання ЕС.
- Павышэнне інфармаванасці насельніцтва аб падтрымцы ЕС грамадзянскай супольнасці ў краінах Усходняга партнёрства.

Падрыхтаваны інфармацыйны бюлетэнь: 12.08.2022